

КАНСТАНЦІН СІМАНАЎ І МАГІЛЁЎ 4

НАСТАЎНІК ГОДА: ПРА САКРЭТЫ ПРАФЕСІІ 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ЛІСТАПАДА 2020 г. СУБОТА № 233 (29347)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ПУЗЫРЭВІЧ, загадчыца кафедры сацыяльнай і сямейнай псіхалогіі Інстытута псіхалогіі БДПУ імя Максіма Танка:**

*«Педагог павінен валодаць разам з прафесійнымі ведамі тымі маральнымі характарыстыкамі, якія змогуць паказаць дзіцяці, што яно можа абапірацца на гэтага чалавека, давяраць яму, узаемадзейнічаць з ім на роўных. Педагог, які стварае ў калектыве такі мікраклімат, здольны весці за сабой і паказваць: сёння вы гэта можаце зрабіць разам са мной, але заўтра наступіць момант, калі вы зможаце зрабіць гэта самі. Жаданне прытрымлівацца гэтага шляху вельмі важнае».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# На такіх людзях трымаецца і суверэнітэт, і незалежнасць, і наша краіна

**Як ідзе барацьба за жыцці і здароўе «ковідных» пацыентаў, Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку расказалі ў 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска**

**Тэма каранавіруса ўжо год не пакідае стужкі навін. Калі кітайцы ў студзені закрывалі на карантын горад Ухань, здавалася, гэтая геаграфічна далёкая і невядомая навала нас абміне. Але ўжо праз месяц першы выпадак заражэння COVID-19 рэгіструецца ў Беларусі, і з таго часу пачынаецца адчайная барацьба з нябачным ворагам, які ўвесь час змяняе свае сімптомы і падстройваецца пад метады лячэння. У сталіцы Беларусі, якая адным з першых гарадоў у краіне прыняла ўдар «ковіду» на сябе, на «перадавой» была 6-я гарадская клінічная бальніца. Таму менавіта з гэтай лакацыі Прэзідэнт пачаў сваё знаёмства з практыкай лячэння каранавіруса ў краіне.**



Фота БелТА.

СТАР. 2



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Невялікая вёска Май Рэчыцкага раёна ў апошнія гады ператварылася ў дачны пасёлак — у бацькоўскія хаты нашчадкі прыязджаюць хіба ў вяснова-восеньскі сезон. А вось Аляксандр ГАРМАНЕНКА — былы нафтавік (вадзіцель і газазваршчык), калі выйшаў на пенсію, вярнуўся на малую радзіму і стаў сапраўдным гаспадаром: на яго падворку гадуюцца авечкі, трусы, чароды свойскай птушкі. Агароджу, браму і вокны старэнькай бацькоўскай хаты Аляксандр Іванавіч упрыгожыў сілуэтамі птушак — сімваламі жывой і багатай прыроды.

# Сініцы зімуюць у Маі

## КОРАТКА

- **Работы прадстаўнікоў БДУ заваявалі дыпломы розных ступеняў на II Міжнародным форуме маладых дызайнераў «Прастора дызайну».**
- Нацыянальны банк са студзеня 2021 года будзе праводзіць штомесячныя аўкцыённыя аперацыі па выдачы крэдытаў.
- **Дабрачынная выстаўка творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі «Сэрца на далоні» праходзіць у выставачнай зале музея гісторыі Магілёва.**
- Журы вызначыла пераможцаў радыёконкурсу чытальнікаў паэтычных твораў Караткевіча.
- **Ізраільскія хасіды падзякавалі беларускай дзяржаве за дапамогу паломнікам у верасні.**
- У штаб-кватэры НАК Беларусі падвялі вынікі рэспубліканскага конкурсу «Алімпійскі агонь запальвае сэрцы».

Кузня чэмпіёнаў

# Не матывацыя — любоў

## «Вікторыя», якая робіць з Гродна баскетбольную сталіцу



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Гродна — горад з багатай не толькі культурнай, але і баскетбольнай гісторыяй. У многім гэта заслуга трэнера Аляксандра Шымкавяка, які даў дарогу ў вялікі спорт многім знакамітым баскетбалісткам. Цяпер справу легендарнага спецыяліста працягвае яго жонка Вікторыя ДАЦУН, галоўны трэнер гродзенскай каманды «Вікторыя» і нацыянальнай жаночай зборнай U-16.**

«Вікторыя» ўваходзіць у своеасаблівы баскетбольны холдынг — клуб «Прынёманне». У яго структуру ўключаны дзве асноўныя дарослыя каманды — мужчынская «Гродна-93» і жаночая «Алімпія». А ў жаночай «Вікторыі» і мужчынскай камандзе «Прынёманне» гуляе моладзь. «Вельмі добра, што ў нас функцыянуе такая структура. У «Вікторыі» гуляюць спартсменкі, якія яшчэ вучацца ў школе ці заканчваюць яе, але ў дарослых камандах ім пакуль рана выступаць.

СТАР. 12

ISSN 1990 - 763X